# БУДАЎНІЦТВА ПАКРОЎСКАГА САБОРА Ў БАРАНАВІЧАХ ПА МАТЭРЫЯЛАХ ЦАРКОЎНАЙ І СВЕЦКАЙ ПРЭСЫ (1926–1931 гг.)

*Булаты П.Ю.*
*(Мінск, ІМСіТ)*

Сярод шматлікіх беларускіх помнікаў сакральнай архітэктуры Пакроўскі сабор у горадзе Баранавічы займае асаблівае месца. Узведзены ў міжваенны час, калі землі Заходняй Беларусі ўваходзілі ў склад Польшчы, і аздоблены сапраўды ўнікальнай мазаікай, баранавіцкі сабор з'яўляецца перлінай царкоўнага будаўніцтва сваёй эпохі. Будаўніцтва новага храма – значная падзея ў жыцці не толькі прыходскай грамады, горада, але і ўсёй царкоўнай супольнасці. У першай палове XX ст. – эпоху развіцця друкаваных сродкаў масавай інфармацыі – працэс ўзвядзення новых святынь знаходзіў адлюстраванне і асвячэнне на старонках шматлікіх газет і часопісаў.

Актыўная стадыя будаўніцтва новай царквы ў Баранавічах (1926–1931 гг.) знайшла адлюстраванне на старонках часопіса «Воскресное чтение» – афіцыйнага друкаванага органа Праваслаўнай Царквы ў Польшчы. Часопіс рэгулярна выдаваўся ў Варшаве на рускай мове. Цягам будаўніцтва ў ім змяшчаліся справаздачы, адозвы будаўнічага камітэту, а таксама фота матэрыял [1; 2; 3; 4; 5; 6; 7]. На заключнай стадыі будаўніцтва грунтоўны артыкул, прысвечаны баранавіцкай царкве, выйшаў у штотыднёвай польскай газеце «Słowo» (выдавалася ў Вільне) [8]. Супаставіўшы звесткі, прадстаўленыя ў розных выданнях (у тым ліку розных па ідэалагічнай афарбоўцы матэрыялу), можна атрымаць бачанне будаўнічага працэсу ў розных яго аспектах. Таксама пры падачы матэрыялу з перыядычных выданняў намі была скарыстаная гістарыяграфічная праца А. А. Гарбунова «История православных храмов г. Барановичи» [9], звесткі з якой дазваляюць акрэсліць і растлумачыць некаторыя значныя моманты, не адлюстраваная на старонках перыёдыкі.

Першы матэрыял, прысвечаны будаўнічым працам у Баранавічах, быў апублікаваны на старонках «Воскресного чтения» у красавіку 1926 г. [1]. Матэрыял гэты досыць абшырны і грунтоўны. У артыкуле пад загалоўкам «Летописная справка» падрабязна апісваецца перыяд будаўніцтва царквы з 1921 па 1926 гг.: паведамляецца аб прычынах пачатку будаўніцтва новай царквы, апісваецца працэс пошуку сродкаў, акалічнасці састаўлення архітэктурнага плану, прыводзіцца справаздача паступленняў і выдаткаў

па стане на 1926 г. Так, а матэрыяле паведамляецца: *«1921 г. 19 апреля на первый день Св. Пасхи, после вечерни, в г. Барановичи сгорел от невыясненной причины приходской храм, первый в Барановичах со времени их возникновения в 80-х гг. прошлого столетия, построенный на средства прихожан в 1908 г. и расширенный в 1915 г. пристройкой к нему исторических приделов в память местопребывания Ставки Верховного Главнокомандующего […] Сослужил он [храм] великую, историческую службу целому нашему краю – без различия его вер и народностей…»* [1]. У сваю чаргу, у газеце «Słowo» таксама прыводзяцца перадумовы будаўніцтва, але ў менш узнёслым рэчышчы і афарбоўцы. Апісваючы падзеі, аўтары абмяжоўваюцца тым, што адзначаюць: «[Да пажару] *гэта была сціплая драўляная святыня, пабудаваная ў 1908 г.*» [8, с. 3].

Згодна са звесткамі, апублікаванымі ў «Воскресном чтении», амаль адразу быў сфармаваны будаўнічы камітэт (старшыня сенатар А.В. Назарэўскі, пастаянныя чальцы – настаяцель прыходу пратаіерэй П. Мацкевіч, царкоўны староста Г.Ф. Яроцкі і інш. [9, с. 77]) і рэвізійная камісія, пачаўся збор ахвяраванняў для аднаўлення храма.

Царкоўна-будаўнічы камітэт намагаўся як мага хутчэй пачаць аднаўленне храма. У хуткі тэрмін быў складзены план будаўніцтва. Але справа замарудзілася і праект доўга не зацвярджаўся. У артыкуле ў «Воскресном чтении» лаканічна і без падрабязнасцей паведамляецца, што «*начало работ задерживалось не утверждением плана и сметы на построение деревянного храма*» [1]. Даследчык А. Гарбуноў адзначае, што план не зацвярджаўся на ўзроўні Наваградскага ваяводства [9, с. 79]. Іншыя прычыны і ацэнкі падаюцца ў артыкуле газеты «Słowo»: «*Пачаткова была задумка пабудаваць драўляную царкву. Але Міністэрства веравызнання і асветы (Ministerstwo Wyznań Religijnych i Oświecenia Publicznego – аўт.) працівілася гэтаму. Жадала каменную царкву. Гэта пацягнула за сабой распрацоўку новых планаў, вялікае павелічэнне кошту і адцягнула на некалькі гадоў завяршэння будаўніцтва святыні, але – паведамляе айцец Павел Мацкевіч – мы за тое ўдзячныя, бо мае прыгожую царкву*» [8, с. 3]. Канчаткова план будаўніцтва быў зацверджаны ў чэрвені 1924 г.




*Малюнак 1. – Праект Баранавіцкага Пакроўскага сабору*

У абодвух выданнях надаецца ўвага асобам, якія распрацоўвалі план будаўніцтва (гл. Малюнак 1). Першапачатковы план, не зацверджаны, быў састаўлены інжынерам Дуброўскім і тэхнікамі Слабейка і Жыткоўскім. Прыняты да рэалізацыі праект распрацаваў архітэктар М.А. Абалонскі «*відавочна ж рускі, які стала жыве ў Варшаве*» [8, с. 3], як характарызуе яго «Słowo». Будаўнічымі працамі задарма (і гэта адзначана ў абодвух выданнях) кіраваў інжынер І.В. Стакоўскі – «*католик* [1]»/«*паляк* [8, с. 3]». Таксама адзначана, што за сваю адданую працу інжынер быў адзначаны адмысловым пахвальным лістом Мітрапаліта Варшаўскага. Падзяка яму была выказаная і ад імя камітэта па будаўніцтву [1; 8, с. 3].

У красавіцкім артыкуле 1926 г. у «Воскресном чтении» апісваецца шэраг падзей, якія адбываліся ў акрэслены будаўнічы перыяд – візіт Уладыкі Дзіянісія ў 1922 г., кароткая справаздача па этапах будаўніцтва. Матэрыял суправаджаўся ілюстрацыямі (прадстаўленым планам і фотаздымкам з будоўлі, на якім паказаныя ўзведзеныя на 6 метраў сцены храма) [1].

Натуральна, што галоўнае месца ў матэрыяле займалі пытанні фінансавання. Калі ў газеце «Słowo» грашовыя крыніцы акрэсліваліся агульнымі словамі, – паступленне ахвяраванняў, зборы, дапамога дзяржавы [8, с. 3] – то ў «Воскресном чтении» прыводзіцца падрабязная справаздача аб фінансавых паступленнях на ўзвядзенне храма [1]:

| А. Поступления за время от 5 мая 1921 г. до 5 мая 1924 г., – ко времени валютной реформы: | | **В. Поступления за время от 5 мая до 11 апреля 1926 г.:** | |
|---|---|---|---|
| **Mrk.** | | | **Zł.** |
| 1) Кружечный сбор в кладбищ. церкви | 145 018 914.45 | 1) Кружечный сбор в кладбищ. церк. | 1 374.97 |
| 2) Кружечный сбор в церк. Полес. епархии | 7 574 673 | 2) Кружечный сбор в церк. Полес. епархии | 762.24 |
| 3) Пожертвования по подп. листам | 131 001 337.30 | 3) Пожертвования по подп. листам и членские взносы | 3 004.27 |
| 4) Уличный кружечн. сбор в день Св. Троицы | 2 988 373 | 4) Уличный кружечн. сбор в день Св. Троицы | 1 040.24 |
| 5) Субсидии Магистрата г. Барановичи | 508 030 000 | 5) Субсидии магистрата | 8 944.40 |
| 6) Субсидии Повятового Сеймика | 2 315 338 495 | 6) Субсидии Правительства | 10 000 |
| 7) От реализации пожертв. ценност. | 51 060 | 7) Субсидии Повятового Сеймика | 1 175.53 |
| 8) Суммы, переданные Комитету Церковн. старостой сгоревш. церкви | 56 083 | 8) Сбор с представлений: от старостины г. Квециньской и От Русского благотв. общ. | 376.25 |
| **Mrk. pol. 3 107 065 462.75** | | 9) Получено %% за капитал помещённый в банк | 372 |
| | | 10) От продажи дерева | 1 426.50 |
| **Złot. 28 476.48** | | | |

Составил по поручению Комитета Непременный член Церковно-Строительного Комитета Настоятель, Протоиерей Павел Мацкевич

Наступныя звесткі, якія датычыцца будаўніцтва сабора ў Баранавічах, апублікаваныя ў «Воскресном чтении» за 1929 г. У часопісе прыводзіцца вялікая фота справаздача з будоўлі, якая адлюстроўвае стан узвядзення царквы за 1928 г. На здымках адлюстраваны ход будаўнічых прац над скляпеннямі бакавых прытвораў, працы над мураваным перакрыццём пад купалам, якія вяліся ў жніўні 1928 г., узвядзенне рашатавання купала, прыводзіцца агульны від храма па стане на верасень–снежань 1928 г. Публікуецца агульны здымак сяброў Царкоўна-будаўнічага камітэту [2, с. 250].

У жніўні 1929 г. у «Воскресном чтении» публікуецца заклік будаўнічага камітэту да вернікаў, прымеркаваны да дня збору ахвяраванняў (дзень Праабражэння Гасподняга). У «Воззвании» гаворыцца: «*Постройка приходского храма в Барановичах, большом и важном пограничном пункте, не имеющем в данное время особой приходской церкви, представляется делом крупного значения для Православной Церкви в Польше. Постройка этого храма, начатая пять лет тому назад, ведётся с большой энергией и успешно, причём в истешем году возведён уже главный купол храма и водружён золотой крест*» [3]. Як адзначае А. Гарбуноў, узвядзенне залачонага шасціканцовага крыжа адбылося ва ўрачыстай абстаноўцы з удзелам шматлікіх вернікаў 20 лістапада 1928 г. [9, с. 110]. Далей у заметцы гаворка ідзе пра апеку і клопат аб будаўніцтве правячым архірэям, дадаецца заклік да айцоў-настаяцеляў «*с покорнейшею просьбою обратить своё внимание на усиление сбора*» [3] сродкаў для дапамогі ў будаўніцтве.

Будаўнічы сезон 1929 г. быў апісаны ў публікацыі 1930 г. Да гэтага часу купал храма быў ацынкаваны, шар на купале пакрыты меддзю, узведзеная алтарная апсіда і два порціка над вонкавымі калонамі, пафарбаваныя летнія і зімнія аконныя рамы, устаўленае шкло, былі зробленыя 220 жалеза-бетонных слупкоў для агароджы ўвышыню 3 метры. Да справаздачы далучана два здымкі – з агульным выглядам і з акцэнтам на выгляд завершанага купалу [4].

У год завяршэння будоўлі – 1931 г. – друкавалася справаздача за 1930 г., калі былі ўзведзеныя два паверхі званіцы, накрытыя часовым дахам. Стан будоўлі прыводзіўся на фотаздымку ў справаздачы (Малюнак 2). Справаздача аб ходзе будаўніцтва суправаджалася справаздачай па грашовых выдатках [5]:

Работы начаты при 5 000 зл. субсидий, полученных
от Министерства W. R. I O. P.

Израсходовано на постройку

Злот.

| | |
|---|---|
| Кирпича 100 000 шт. | 8 000 |
| Цемента 51 бочка | 1 275 |
| Извести гашеной 15 000 кл. | 900 |
| Плит цементных 220 шт. | 286 |
| Рельс и балок 1 | 1920 |
| Железа полосового и оцинков. жести | 640 |
| Досок и брусьев 10 кв. метр. | 550 |
| Громоотвод и рабочая сила | 7429 |

Всего 21 000

Председатель Цер. Стр. К-та. А. Назаревский

Прыводзіўся ў матэрыяле і заклік да вернікаў з падзякай за ахвяраванні, а таксама з просьбаю дапамагчы завяршыць будаўніцтва і выдаткаваць дадатковыя сродкі [5].



Общій видъ новостроющейся Св. Покровской церкви въ гор. Барановичахъ.

*Малюнак 2. – Будаўніцтва Баранавіцкага Пакроўскага сабору, 1930 г.*

Напярэдадні прастольнага свята (Пакрова Прасвятой Багародзіцы) епархіяльнай пастановай ад 8.X.1931 г. № 10247, якая публікавалася ў «Воскресном чтении» [6], былі ўзнагароджаныя удзельнікі будаўніцтва сабору і датычныя да працэсу асобы. Так, царкоўны стараста Баранавіцкага сабору Георгі Філіпавіч Яроцкі быў узнагароджаны старасціным кафтанам. Баранесе Марыі Андрэеўне Бер за ахвяраванні на будаўніцтва была выказаная архіпастырская падзяка. Прыхаджанам – бліжэйшым супрацоўнікам па будаўніцтву сабора – архіпастырскае дабраслаўленне з выдачай агульнай граматы. Чальцы будаўнічага камітэту: Аляксей Віктаравіч Назарэўскі, Мікалай Іванавіч Канода, Андрэй Андрэевіч Пронін, Іван Іванавіч Бахар (сакратар), Аляксандр Іванавіч Аляшкевіч, Фёдар Рыгоравіч Кулеша і Пётр Лявонцьевіч Альшэўскі – узнагароджаныя дабраслаўлёнымі граматамі, а Уладзімір Віктаравіч Зелянеўскі, Варфаламей Эдуардавіч Казакевіч, Кісьма Васільевіч Брыша і Уладзімір Іванавіч Сусленікаў – атрымалі пахвальныя лісты.

Урачыстае асвячэння новага сабору адбылося 4 кастрычніка 1931 г. На старонках «Воскресного чтения» ў артыкуле «Освящение нового храма в Барановичах» паведамлялася: «*В воскресенье 4 октября с. г. В Барановичах состоялось торжественное освящение новопостроенного Свято-Покровского собора, воздвигнутого на месте церкви, сгоревшей в 1922 г. [пажар на самой справе адбыўся ў 1921 г. – аўт.] по неизвестной причине. Освящение было совершено лично Высокопреосвященным Алексием, Архиепископом Гродненским и Новогрудским. Подробное описание сего торжества будет нами дано в ближайшее время*» [7, с. 584]. Аднак, па невядомых прычынах анансаваны матэрыял так і не з’явіўся на старонках «Воскресного чтения». Таксама дададзім, што ў артыкулах часопісу не згадваюцца мазаікі, якія былі прывезеныя ў Баранавічы са зруйнаванага ў Варшаве сабору Св. А. Неўскага [9, с. 81–109].

Асвячэнню новай царквы ў Баранавічах прысвечаны артыкул у газеце «Słowo». Самі ўрачыстасці апісваюцца досыць сціпла: адзначаецца візіт архіпастыра і навагрудскага ваяводы, паведамляецца, што асвячэнне праваслаўнымі вернікамі чакалася з асаблівым эмацыйным узрушэннем. Таксама ў газетным артыкуле прыводзіцца апісанне ўзведзенай царквы і развагі над яе знешнім выглядзе: «*Праз дзесяць год, на тым самым месцы, узвышаецца пабудова, моцна адрозная ад даўняй. Царква вялікая і мураваная, з вежай ад фронту, якая парыць над будынкам, з гарманічным купалам, з двума бакавымі парталамі, узнесенымі на чатырох калонах. Яскравая свежасць цэглы, яшчэ не тынкаванай, стварае ўражанне спа-*

*кою, класічнай цэласці [...]. ...Мы, палякі, бачачы ўзнесеную над горадам вежу, можам пацвердзіць кожнаму: "Гэтая царква пабудаваная на землях свабоднай Рэчы Паспалітай". І таму з задавальненнем сцвярджаем, што гмах у сваёй архітэктоніцы цалкам заходні; заўважым нават думку, што сваім касіцыстычным выглядам ён востра супрацьпастаўляецца атачэнню: агромністы пляц, шырокі, небрукаваная вуліца, драўляныя хаціны, блукаючыя сяляне і малыя коні з дугамі – усё тое выдае нам прывабнасць царкоўнай вежы з калонамі...*» [8, с. 3].

Такім чынам, разгледзеўшы звесткі аб працэсе будаўніцтва Пакроўскага сабора ў Баранавічах, прадстаўленыя на старонках перыядычных выданняў (часопіс «Воскресного чтения» і газета «Słowo») і супаставіўшы іх, можна адзначыць наступнае. Безумоўна, галоўныя ўсе падзеі і справаздачы друкаваліся на старонках афіцыйнага царкоўнага выдання. Свецкае выданне звярнула ўвагу на будоўлю артыкулам, прымеркаваным да асвячэння сабора. Розняцца і ідэалагічныя ацэнкі ў выданнях, па-рознаму акрэсліваюцца прычыны некаторых падзей (галоўным чынам, адрозніваюцца прыведзеныя ў публікацыях прычыны маруджання ў працэсе зацвярджэнне плана будоўлі).

## КРЫНІЦЫ І ЛИТАРАТУРА:


1. Воскресное чтение. – 1926. – Апрель.
2. Воскресное чтение. – 1929. – №16.
3. Воскресное чтение. – 1929. – №32.
4. Воскресное чтение. – 1930. – №8.
5. Воскресное чтение. – 1931. – №14.
6. Воскресное чтение. – 1931. – 8 октября.
7. Воскресное чтение. – 1931. – №41.
8. Słowo. – 1931. – Nr. 224.
9. Горбунов, А. А. История православных храмов г. Барановичи / протодиакон Андрей Горбунов. – Минск : Красная звезда, 2017. – 188 с.